
INFARMATAR



Інстытут Беларускай Культуры
Instytut Kultury Białoruskiej

Nr 1 /2001 sakavik (marzec)

ШАНОЎНЫ ЧЫТАЧ!

Гэтым бюлетэнем мы распачынаем знаёмства з Нашай Краінай – зь Беларусяй. Гэтая ціхая, але ганарлівая ўсходняя суседка Польшчы заслугоўвае на ўвагу. Гісторыя беларускай дзяржаўнасьці сягае амаль на 1000 гадоў у мінуўшчыну, калі найбольшага росквіту дасягнулі Полацкае й Тураўскае княствы. Пазьней – з 13-га стагодзьдзя й на працягу амаль 500 гадоў – беларускія ды польскія ваяры чынна змагаліся за веліч і гонар Вялікага Княства Літоўскага. Чарговымі старонкамі гісторыі было ўваходжаньне ВКЛ у фэдэратыўную дзяржаву Рэч Паспалітую, а з канца 18-га ст. – у склад Расейскай імпэрыі.

Як вынік нацыянальна-вызваленчага руху 19-га ст. 25 сакавіка 1918 года была абвешчаная Беларуская Народная Рэспубліка – вольная й незалежная краіна з адзінай і абавязковай дзяржаўнай мовай – беларускай. Быў створаны ўрад, адчыняліся беларускія газэты, унівэрсытэты, тэатры...

Сёньня, сьвяткуючы Дзень Волі Беларусі 25 сакавіка, мы верым, што здолеем захаваць, адрадзіць і ажыцьцявіць дэмакратычныя традыцыі незалежнай Беларусі, што Нашая Краіна дачакаецца сьветлых дзён, калі зможа вярнуцца на сваё гістарычнае мейсца – у Эўропу.

Інстытут Беларускай Культуры

Jeżeli trzymasz w rękach ten numer „INFARMATARA", pierwszy w dziejach Instytutu Kultury Białoruskiej w Warszawie, to znaczy, że jesteś tak czy inaczej związany z Białorusią, a może dopiero czeka Cię przygoda poznania naszego pięknego kraju. Bo właśnie do tych, którzy tęsknią za ojczyzną studiując w Polsce, którzy czują się częścią białoruskiego narodu rozrzuconego po świecie, którzy znają i lubią Białoruś czy też chcą bliżej poznać jej historię i kulturę, adresowana jest nasza gazeta.

Chcemy przybliżyć Ci wydarzenia z bliskiej i dalszej historii białoruskiego państwa, odkryć urok i głębokie korzenie narodowych tradycji jak również sztuki białoruskich twórców, zapoznać z ludźmi i ideami, które kształtują dzisiejszą społeczną i polityczną dyskusję na Białorusi. Jednocześnie chcemy szerzej promować kulturalne życie białoruskiej społeczności w Polsce, a także pomagać w rozwiązaniu problemów, z którymi spotykają się tu Białorusini. Mamy nadzieję, że pomożesz nam w tym, zwracając się do nas z interesującymi Ciebie pytaniami, propozycjami ciekawych tematów, opowiadając o swoim widzeniu podniesionych w naszej gazecie problemów. Możesz pisać do nas w językach białoruskim lub polskim – językach dawnej Rzeczypospolitej Obojga Narodów.

Witamy cię w gronie przyjaciół Instytutu Kultury Białoruskiej i naszej gazety! Działalność Instytutu została zainaugurowana w listopadzie ubiegłego roku koncertem Kasi Kamockaj, jednej z czołowych wykonawczyń niezależnego rocka na Białorusi. W niezwykłej atmosferze odbyła się kolejna impreza Instytutu, wskrzeszająca tradycje białoruskiego Kolędowania. W najbliższych planach Instytutu spotkanie ze światowej sławy białoruskim pisarzem Vasilem Bykawym. O kolejnych imprezach Instytutu przeczytasz na stronach „INFARMATARA". Spotkamy się ponownie już za miesiąc!

Redakcja

W NUMERZE

WIADOMOŚCI

■ Aleksander Łukaszenka wydał dekret wymierzony w organizacje korzystające z zagranicznego wsparcia. Od tej pory pomocy humanitarnej z zagranicy nie wolno wykorzystywać do prowadzenia działalności "mającej na celu zmianę ustroju państwowego i obalenie władzy". Mówiąc konkretnie, pomoc humanitarna nie może być wykorzystywana w kampanii przed wyborami lub referendum, przy organizowaniu zgromadzeń, wieców, marszów i demonstracji. Nie wolno z niej także korzystać przy wydawaniu i kolportowaniu materiałów agitacyjnych. Żadnej pomocy z zagranicy nie mogą przyjmować partie polityczne. Organizacjom naruszającym dekret grozi delegalizacja.

■ Komitet organizacyjny obchodów Dnia Woli Białorusi 25 marca zwrócił się do narodu z oświadczeniem: "25 marca 1918 roku w Mińsku proklamowano niepodległą Białoruską Republikę Ludową. Wśród ideałów, które jej przyświecały, były wolność, pokój, sprawiedliwość. To właśnie dzięki BRL nasi chłopcy nie giną teraz w Czeczenii. Większość Białorusinów nie chce dalej żyć tak jak teraz. Tylko od nas zależy, jakie będzie jutro Białorusi. Wzywamy: dołączcie się do obchodów Dnia Woli. Razem uczyńmy Białoruś szczęśliwą".

■ "Najmroczniejszym spośród tworów powstałych po rozpadzie ZSRR" nazwał Białoruś Arnold Bachman, redaktor "Washington Times", komentując wyniki wizyty na Białoruś przedstawicieli OBWE i Unii Europejskiej. Według słów Bachmana "prezydent-tyran Łukaszenka i jego rząd nie zrobili nic dla rozwoju demokracji. Na Białorusi toczą się pokazowe procesy polityczne, opozycyjni politycy znikają, a wolność słowa jest naruszana".

■ Za krytykowanie polityki transmisji programów sportowych białoruskiej państwowej TV został usunięty z pracy dziennikarz redakcji sportowej Alaksiej Dowal. Komentując udane wystąpienie białoruskich biatlonistów na mistrzostwach świata, A. Dowal wyraził żal, że tak znaczące wydarzenie zostało zignorowane przez państwowe media, ponieważ Łukaszenka, jak powszechnie wiadomo, woli hokej.

■ Białoruskie władze przerwały na blisko dwie godziny emisję programu rosyjskiej stacji telewizyjnej NTV - retransmitowanego na terytorium RB. Widzów poinformowano, że białoruska Komisja zajmująca się zwalczaniem pornografii, przemocy i okrucieństwa, nie zgodziła się na retransmisję zapowiedzianego w programie francuskiego filmu "Doberman."


■ Do aresztu deportacyjnego w Warszawie trafił białoruski przedsiębiorca Leanid Vowk. Wniosek o zatrzymanie go złożyły władze w

ciąg dalszy na s. 3

WYDARZENIE MIESIĄCA

NASZA NIEPODLEGŁOŚĆ

albo od czego to się zaczęło



Ludowy Sekretariat Białorusi. Od lewej stoją: Aliaksandar Smolič, Piotra Kračewski, Kanstantyn Jezavitaw, Anton Awsiańnik, Lieanard Zajac, siedzą: Aliaksandar Burbis, Ivan Sierada, Jazep Varonka, Bazyl Zacharka.

Apogeum białoruskiego odrodzenia narodowego przypada na początek XX wieku. Mianowicie w tym czasie uaktywniają się koła intelektualne, powstają pierwsze partie polityczne. W związku z zaistniałą po roku 1917 sytuacją międzynarodową zaczyna się walka o własną państwowość.

Pierwszy Wszechbiałoruski Zjazd został zwołany 7 grudnia 1917 roku. Z różnych stron Białorusi oraz Ukrainy i Rosji przyjechali delegaci białoruskich formacji wojskowych, ziemstw gubernialnych, samorządów powiatowych, gminnych związków zawodowych. W sumie zarejestrowano 1872 delegatów. Przewodniczącym zjazdu został przedstawiciel Centralnej Białoruskiej Rady Wojskowej Iwan Sierada. Jednak na rozkaz A. Miasnikova (właśc. Aleksander Miasnikian), przewodniczącego Północno-Zachodniego Komitetu Obwodowego RKP(b), prezydium aresztowano, a delegatów brutalnie rozpędzono. Zjazd, zanim został rozpędzony, zdążył wybrać Radę, która z kolei powołała Komitet Wykonawczy I Wszechbiałoruskiego Zjazdu. Przewodniczącym Komitetu został Józef Varonka, resort spraw wojskowych powierzono Szymonowi Rak-Michajłowskamu, a spraw wewnętrznych Iwanowi Sieradzie.

W lutym 1918 r. rozpoczęły się rokowania pokojowe w Brześciu między Rosją Radziecką a Niemcami. Na życzenie przewodniczącego delegacji radzieckiej Lwa Trockiego Niemcy nie wpuścili na konferencję przedstawicieli białoruskiego Komitetu Wykonawczego. Z powodu nie podpisania zobowiązań spłacenia kontrybucji przez przedstawicieli delegacji rosyjskiej armia niemiecka ruszyła na wschód. Na wieść o zbliżaniu się wojsk niemieckich bolszewicy uciekli z Mińska. Tego samego dnia, kiedy Niemcy weszli do stolicy (21 lutego), Komitet Wykonawczy Rady I Wszechbiałoruskiego Zjazdu wydał deklarację, w której ogłosił się najwyższą władzą cywilną na Białorusi. Odwołując się do prawa narodów do samostanowienia, autorzy dokumentu stwierdzali, że władza na Białorusi powinna być tworzona zgodnie z wolą ludzi ten kraj zamieszkujących. Zasada ta powinna być realizowana przez demokratyczne wybory do Wszechbiałoruskiego Sejmu Ustawodawczego. W tej deklaracji po raz pierwszy nie było mowy o autonomii w składzie federacji rosyjskiej. Komitet Wykonawczy powołał Sekretariat Ludowy, przewodniczącym został Józef Varonka. Na początku Niemcy nie uznali rządu białoruskiego. Jednak już pod koniec lutego doszło do rozmów między Sekretariatem a niemiecką administracją wojskową, w wyniku których okupanci uznali rząd Varonki za reprezentację ludności białoruskiej.

25 marca 1918 roku Rada Bialoruskiej Republiki Ludowej (BRL) ogłosiła niepodległość Białorusi. Państwo to miało obejmować Mohylewszczyznę, Mińszczyznę, Witebszczyznę, Grodzieńszczyznę (z Białymstokiem), białoru-

WYDARZENIE MIESIĄCA

skie obszary Wileńszczyzny, Smoleńszczyzny, Czernihowszczyzny.

W czerwcu 1918 roku rząd BRL zawiesił dekrety i rozporządzenia RSFSR. W związku z tym władze okupacyjne w kompetencje Sekretariatu Ludowego przekazały handel, przemysł, opiekę socjalną, oświatę i kulturę.

Największe osiągnięcia BRL miała w dziedzinie kultury i oświaty. Jeszcze pod czas okupacji niemieckiej zachodniego terytorium Białorusi w l. 1915-1917 zostało otwartych 89 białoruskich szkół. Zorganizowane zostały kursy nauczycielskie w Wilnie i w Śvisłačy. Były wydawane periodyki „Homan" i „Biełarus". W Wilnie został otwarty klub białoruski z teatrem F. Alchimoviča, białoruska księgarnia, biblioteka.

Od momentu, kiedy w niepodległym kraju język białoruski stał się państwowym, według różnych obliczeń funkcjonowało od 150 do 350 szkół. Były otwarte gimnazja w Budsławiu, Nowogródku, Słucku, Grodnie, Mińsku. W Mińsku powstała Wyższa Szkoła Pedagogiczna, wykładali w niej m. in: U. Ivanouski, I. Ihnatowski, J. Karski, B. Taraškievič. W ramach przekwalifikowania, były prowadzone kursy języka białoruskiego. W czerwcu 1918 r. została otwarta wyższa szkoła muzyczna (później – Konserwatorium). Powstało także katolickie seminarium duchowne, rektorem którego został dr filozofii F. Abrantovič. Przy rządzie BRL działała komisja, przygotowująca otwarcie Białoruskiego Uniwersytetu w Mińsku. W planach było także otwarcie Akademii Politechnicznej i Akademii Rolniczej. W tym czasie ukazały się „Biełaruskaja Hramatyka dla szkoł" B. Taraškieviča i „Biełaruski pravapis" A. Łuckieviča i J. Stankieviča. Została powołana pierwsza instytucja naukowa - „Biełaruskaje Navukovaje Tavarystva w Vilnie". Na podstawie kolekcji J. Łuckieviča w Wilnie i Mińsku była zorganizowana pierwsza wystawa malarska. Od tego momentu zostały wprowadzone pojęcia białoruskiego malarstwa i białoruskiej szkoły malarstwa, podjęte systematyczne badania nad historią białoruskiego malarstwa, grafiki, architektury. Ukazały się nowe tytuły „Biełaruski šlach" (Mińsk), „Rodny Kraj" (Słuck), czasopismo „Varta", i „Biełaruski ilustravany czasopis". Został otwarty w Mińsku Białoruski Dom Ludowy imienia M. Bahdanoviča, który później stał się siedzibą Białoruskiego Państwowego Teatru. Za symbole państwowe zostały uznane herb „ Pahonia" i biało-czerwono-biała flaga. Hymn „My wyjdziem szczylnymi radami" (muz. Tarawskiego, sł. Kaścievіča), został przyjęty w 1920 roku. Tego samego roku wraz dotraciem Armii Czerwonej Rada BLR musiała szukać schronienia poza granicami Białorusi. Rada dotychczas obraduje w USA, jej prezydentem jest Ivonka Survilła.

HALINA VAŚKO,
studentka historii UW

KĄCIK FILOLOGA

Dzień dobry! Дабрыдзень!

Адчыняем рубрыку "Kącik Filologa", дзе паспрабуем параўнаць польскую й беларускую мовы з пункту гледжаньня лексыкі, сэмантыкі, граматычнага ладу, фразэалёгіі і г. д.

Блізкае суседзтва й супольная мінуўшчына спрыялі моцнаму узаемадзеяньню, глыбокаму моўнаму ўзаемапранікненьню і ўзбагачэньню. Ужо таму для палякаў беларуская мова не зьяўляецца цалкам чужой і незразумелай: мае падобную да польскай марфалагічную й сінтаксічную сістэму, абедзьве мовы маюць велізарны супольны лексічны пласт. Асноўныя цяжкасці пры вывучэнні беларускай мовы палякамі ўзнікаюць у вымове, што зьвязана з пэўнымі фанетычнымі асаблівасьцямі. Вось найважнейшыя зь їх:

– замена зычнага **g** гукам **h** (звонкім), напрыклад у словах: нага noga, гара góra;

– слабейшае, чым у польскай мове. памякчэньне зычных **з', с', ц', дз'**, якія ў беларускай літаратурнай мове гучаць падобна як у польскіх словах sinus, zirytować, cis, а не як у словах siano, zima, cicho;

– наяўнасьць падвойных зычных: **з'з', с'с', дз'дз', ц'ц', л'л', н'н', шш, чч, жж**, напрыклад у словах: калосьсе, судзьдзя, жыцьцё, зельле, пытаньне, зацішша, ноччу, збожжа;

– чаргаваньне зычных **в і л з ў**. Гукі **в** і **л** могуць ужывацца толькі ў становішчы перад галосным, у іншых пазыцыях, г. зн. перад зычнымі і на канцы слова, чаргуюцца з **ў**. Напрыклад, галава-галоў, кла-ла-клаў, крыкнула-крыкнуў;

– адсутнасьць насавых галосных **ę** і **ą** , іх замянілі ненасавыя **а** і **у**: дуб-dąb, мяса-mięso, пяць-pięć, крыкнуў-krzyknął;

– галосныя **э** і **о** пасьля цвёрдых зычных ужываюцца толькі пад націскам. У ненаціскных пазіцыях ім адпавядае галосны **а**, напрыклад, дом-дамы, шэсьць-шасьці;

– пасьля мяккіх зычных галосным **э, о** ў першым складзе перад націскам адпавядае галосны **а**, у астатніх складах – **э**. Адпаведна адбываецца патройнае чаргаваньне: лес-лясы-леснікі, вёсны-вясна-веснавы. У запазычаных яшчэ не адаптаваных да беларускай мовы словах у першым складзе перад націскам галосны **э** захоўваецца: бэтон, сэзон;

– чаргаваньне галоснага **у** з зычным **ў** у становішчы паміж галосным і зычным: уехаць у лес – зайсьці ў школу.

Націск ў беларускай мове свабодны рухомы ў адрозненні ад польскага сталага: дом–дамы, праўда–праўдзівы–сапраўды.

НАДЗЕЯ КІСЯЛЁВА,
студэнтка белар. філялёгіі UW

WIADOMOŚCI

ciąg dalszy ze s. 3

Mińsku oskarżając go o niepłacenie podatków w okresie, kiedy L. Vowk pełnił obowiązki dyrektora "Klasa-Klubu" w Mińsku. Zjednoczona Partia Obywatelska (AHP) ogłosiła, że przedsiębiorca, będąc na Białorusi, pomagał opozycyjnym politykom i właśnie dlatego jest teraz ścigany przez władze.

■ Federacja Anarchistów Białorusi uczciła w Mińsku Dzień Sowieckiego wojska spaleniem na placu Swabody wezwań na komisję rekrutacyjną. Przyjęto także przysięgę - nigdy nie służyć w wojsku. Dziwnym zbiegiem okoliczności, w ten sam dzień Sztab Generalny Wojska Białoruskiego powiadomił, że projekt ustawy "O służbie zastępczej" będzie gotowy już w marcu lub kwietniu. Ustawa dotyczyć będzie osób karanych oraz wyznawców religii, które zabraniają posługiwania się bronią "z powodu przekonań religijnych". Osoby z wyższym wykształceniem będą służyć "alternatywnie" 18 miesięcy, pozostali - 27.

■ 1 marca płaca minimalna na Białorusi została podniesiona do 5700 rubli (z 3600). Kurs dolara USA wynosi teraz na Białorusi 1300 rubli.

■ Przed mińską siedzibą państwowej Telewizji Młody Front zorganizował akcję "Opłata za reklamę". Chłopcy w czarnych okularach przynieśli skrzynkę prezentów dla autorów programów "Rezonans" i "Ukryte sprężyny polityki". W programach tych, w tygodniu poprzedzającym akcję, autorzy trzy razy mówili o Młodym Froncie, demaskując jego rzekomo wywrotową działalność. Publicyści państwowej TV stwierdzili, że organizacja ta przy współpracy z opozycją i amerykańskimi tajnymi służbami specjalnymi ma zamiar obalić reżym Łukaszenki w roku 2001. Prezenty - drobne pieniądze różnych krajów i wodę toaletową "Dolar" przekazano strażnikom.

■ 18 lutego w Witebsku odbyła się pikieta przeciwko budowie w tym mieście fabryki produkującej wysokooktanową benzynę. Pikietujących zatrzymano. 19 lutego za organizację "nielegalnego pochodu" z okazji dnia Świętego Walentego Paweł Siewiaryniec został skazany na grzywnę w wysokości 450 dolarów. W nocy 25 lutego koło budynku władz rejonowych w Mińsku milicja zatrzymała dwóch działaczy Młodego Frontu, którzy malowali graffiti i wieszali flagę. 2 marca koło Instytutu Kultury aresztowano chłopców rozdających egzemplarze gazety "Nasza Swaboda". 8 marca w rejonie mińskiego bazaru "Kamarouka" patrol milicji zatrzymał trojga młodych, którzy rozdawali ulotki.

za wykorzystanie wiadomosci dziekujemy Radyjo Radcyja i Nasa Niva

HISTORIA

SKĄD POCHODZI NAZWA BIAŁORUSI

Analiza książki

Wokół etymologii nazwy Białoruś narosło wiele mitów. Przyjmowano, że termin pochodzi od koloru ubioru, włosów lub cery mieszkańców. Downar-Zapolski uznał za pewnik pochodzenie nazwy od faktu, że ziemie księstw dynastii połockiej i turowo-pińskiej nigdy nie znalazły się pod władaniem tatarskim. Do współczesnych czasów popularną teorią jest przekonanie o występowaniu na Rusi ,,kolorowego" podziału świata na kierunki znanego z kultur ludów tureckich. Nie znajduje to jednak potwierdzenia w zetknięciu z rzeczywistością historyczną. Dość niedawno we współczesnej nauce białoruskiej sformowały się dwa nowe stanowiska co do genezy nazwy ,,Biała Ruś". Pierwszy z nich prezentuje przekonanie o jej ,,autochtoniczności" na ziemiach ruskich; miała ona pierwotnie określać całość Rusi (w znaczeniu ,,świętej", ,,ojczystej"), co można wnioskować ze świadectw średniowiecznych kronik i innych tekstów niemieckich, węgierskich oraz przekazów Tatiszczewa nazywających tym terminem różne regiony w podobnym czasie. Z upływem czasu miałby nastąpić ograniczenie jego denotacji do dawnego województwa połockiego, by w XIX w. rozciągnąć się na ziemie dzisiejszej Białorusi. Zastanawiający jest jednak całkowity brak recepcji tego pojęcia aż po nowożytność w znanych źródłach ruskich. Drugą teorię przedstawił w ubiegłym roku Aleksy Biely na podstawie dokładnych badań większości znanych źródeł pisanych. Jego główne tezy zawiera cytat z książki ,,Kronika Białej Rusi", który prezentujemy poniżej:

«Historia terminu *Ruś Biała* nie jest fenomenem czysto białoruskim (we współczesnym rozumieniu tego słowa). Nazwa ta na przeciągu wieków nie przywiązana była do jednego regionu, ale żyła w pewnym sensie samodzielnie.

Ale *Ruś Biała* w Nowogrodzie Wielkim, w Państwie Moskiewskim, w Wielkim Księstwie Litewskim in. – to nie różne pojęcia, które pochodzą z zupełnie różnych źródeł i tylko przypadkowo zgadzają się w formie, a różne projekcje jednego i tego samego geograficznego terminu. Jego ,,kariera" jest wspaniała ilustracją do drogi, którą przeszła europejska geografia średniowiecza i wczesnej nowożytności od czysto rozumowego opisania odmiennych, tylko fantastycznych, krajów i narodów, do właściwej nauki [...]. Prawdziwe poznanie historii nazwy pozwala w znacznym stopniu rozwiązać problem, który przed stuleciem stanął przed działaczami białoruskiego ruchu narodowego: czy można używać terminu *Białoruś*, jeśli tak długo wykorzystywali ją ,,wielkoruscy" szowiniści, by uzasadnić tezę o „odwiecznej trójjedności" wschodnich Słowian – oczywiście pod rządami „białego rosyjskiego cara"? Okazuję się, że nazwa ta chociaż nadana krajowi przez obcych, przy innym odczytaniu może zaświadczyć o łączności jej historycznego losu z losem europejskiej cywilizacji.

Wiadomości Tatiszczewa o pierwotnym sensie nazwy, w postaci Rusi Włodzimiersko-Suzdalskiej, nie są potwierdzone żadnym autentycznym źródłem i najprawdopodobniej zostały przez niego sfałszowane. Nie ma żadnych podstaw i innego wytłumaczenia, które ugruntowane byłyby na wschodniosłowiańskich źródłach nazwy. Tak naprawdę np. Nowogród, Psków i Połock nie tworzyły takiej wspólnoty jak „krywickie ziemie północnej Białorusi" czy „wolnej części Rusi, terytorium greckiego prawosławia". Nigdy *Russia Alba* nie używała się na oznaczenie, przynajmniej przez samych wschodnich Słowian, jedności tych trzech państwowych centrów [...]. ,,Wielka Ruś" – „Wielikarassija" nie istniała, dopóki jej nie stworzył przymusem Iwan III, którego kroniki i latopisy starannie zniszczyły wszystkie historyczne, charakterystyczne cechy odróżniające dołączone ziemie. Nie oznacza to, że w XV w. nie było idei jedności wschodnich Słowian, lecz uosabiała ją po prostu nazwa ,,Ruś". Łączyła ona nie tylko Moskwa, Twer i Nowogród, ale i ,,ruskie" ziemie w składzie Polski i Wielkiego Księstwa Litewskiego. *Ruś Biała* była tożsama z *Wielką* tylko w tym stopniu, w którym ta ostatnia odpowiadała Nowogrodowi Wielkiemu.

Powstanie terminu *Russia Alba* i jego ugruntowanie w średniowiecznej geograficznej nomenklaturze, związane jest najprawdopodobniej z pomyłkowym wyobrażeniem scholastyków o *Albanii*, która „graniczy na wschodzie z Morzem Kaspijskim i podchodzi na pograniczu do Oceanu Północnego, rozpościerając się do Meotydy i do najdzikszych pustynnych miejsc" (Bartłomiej Angielski). Ta *Albania* to twór skompilowany z Albanii antycznych i wczesnośredniowiecznych autorów (w pierwszej kolejności Izydora Sewilskiego), Alanii przodków współczesnych Osetyńców i północnej „Albanii" Wepsów-Wizów. Początkowo *Russia Alba* mogła oznaczać „część Rusi, która kiedyś była Albanią", lub „krainę, którą kiedyś zasiedlali Albanowie". [...] Pierwszym historycznym źródłem wspominającym Albanów (*Albani-Wizzi*) w znaczeniu bliskim do tego, w którym zazwyczaj będzie się używać terminu *Biała Ruś*, są ,,Dzieje biskupów Kościoła Hamburskiego" (z około 1075 r.) Adama Bremeńskiego. Termin *Ruś Biała* powstał w mowach germańskich, skąd trafił do średniowiecznej łaciny, na długo przed tym, kiedy przyswoiły go języki słowiańskie.

W zależności od tego, gdzie ten lub inny autor umieszczał ,,Albanów", kraju „*Russia Alba*" szukano na dzisiejszym Pojezierzu Rosyjskim lub rzadziej nad Donem północna („cisryfejska") *Russia Alba* w wąskim sensie odpowiadała części Republiki Nowogrodzkiej, rejonowi dawnego osadnictwa Wepsów; w szerokim – całemu Nowogrodowi Wielkiemu, często razem z Pskowem, [...] i z niektórymi sąsiednimi ziemiami, kolonizowanymi przez Nowogród – Wiatką, Permem, ziemią Jugorską. O ile „cisryfejska" lokacja jest podstawowa, początkowa, o tyle pozostawiła najwięcej śladów w dokumentach i na mapach XIII i XIV w. i przetrwały do początków XVIII w. *Russia Alba* nad Donem, czy „transryfejska" odnotowywano od ostatniej ćwierci XV w. [...]. Pojęcie o niej powstało pod wpływem scholastycznych pojęć o Albanii Kaukaskiej i państwie *Albanii Superior*, którą Bekon umieszczał nad górnym Donem oraz o żyjących kiedyś nad Donem Roksolanami – jakoby przodkach wschodnich Słowian. Inni autorzy, którzy w różnym czasie wiązali pochodzenie nazwy z „Białymi Kumanami", „Białymi Scytami", „Białymi Sarmatami", również lokalizowali je w północnej części stepów nadczarnomorskich. Jednak w rzeczywistości można mówić nie o ogólnym pochodzeniu wszystkich tych nazw, włączając *Ruś Białą*, a tylko o staraniach niektórych autorów, by wywieść pochodzenie *Rusi Białej* aż z epoki antycznej. Przy tym nazwy „Biali Scytowie" i „Biali Sarmaci" stworzono jawnie post factum, a istnienie „Białych Alanów" można dopuścić tylko hipotetycznie. Jedyna nazwa z tej grupy funkcjonującą na pewno to „Biali Kumani" (tzn. Połowcy), jednak niczego nie świadczy o jakimkolwiek związku pomiędzy nimi i Białą Rusią. [...]

Ta druga *Russia Alba* nie oddzielała się stopniowo od pierwszej, gdyż, według geograficznych wyobrażeń średniowiecza, źródła Donu-Tanaisu znajdowały się daleko na północy, gdzieś obok Jeź.Ładoga [...]. W miarę tego, jak stawało się wiadomym, że na Donie i w północnej Taurii, zajętych Tatarami, ziemia z taką nazwą nie może istnieć; „transryfejska" „Ruś Biała" w wyobrażeniu Europejczyków przesuwała się dalej na pó-

HISTORIA

łnoc, na Ukrainę i Siewierszczyznę, stopniowo zlewając się z północną, a ta ze swej strony zsuwała się na południe.

Najstarszymi pomnikami wschodniosłowiańskiego pochodzenia, zamieszczającymi wiadomość o „Białej Rusi", są nie opublikowane gramoty wielkiego księcia moskiewskiego Iwana III do papieża Pawła II lub Sylwestra IV. Za takie również trzeba uznać „Wybrane słowo o św. Pismach, będących po łacinie" napisane prawdopodobnie przez Pachomiusza Logothete około 1461 r. i zapewne zredagowane na początku lat siedemdziesiątych XV w. Iwan III, jak i jego syn Wasyl III, nigdy nie przyjął tytułu „wielki książę Białej Rusi" i nie wprowadził terminu *Biała Ruś* na oznaczenie Państwa Rosyjskiego. W XV-XVI w. terminu tego nie znano w Moskwie, za wyjątkiem garstki edukowanych ludzi, obznajomionych z literaturą zachodnioeuropejską. Jednak translacja nazwy *Russia Alba* na Państwo Moskiewskie odbyło się w tradycji europejskiej tak naprawdę w czasach Iwana III. To przeniesienie, zarejestrowane tylko przez cudzoziemców [...] wywołało wejście w latach 1471-1478 w skład Wielkiego Księstwa Moskiewskiego terytorium Republiki Nowogrodzkiej – jedynej części dzisiejszej Rosji, która miała do tego czasu ścisłe handlowe i kulturalne kontakty z zachodem i północą kontynentu europejskiego. Dlatego wiadoma wcześniej Europejczykom *Biała Ruś* stała się synonimem mało znanej na razie Moskovii [...].

Umocnienie w tradycji europejskiej terminu *Russia Alba* w jakości Moskovii sprzyjało również wykorzystanie przez panegirystów domu moskiewskiego wielkiego księcia epitetu „biały" w znaczeniu „wielki", „wysokourodzony". Na ile można sądzić, przypisany był on tylko do osoby moskiewskiego monarchy a nigdy do Moskwy jako państwa. [...]

Nazwa *Biała Ruś* zaczęła się trwale dostosowywać się do części terytorium współczesnej Białorusi, przede wszystkim na początku do Połocczyzny w połowie XVI w. Kolejna zmiana sensu nazwy spowodowana została polityczną sytuacją podczas wojny inflanckiej, w pierwszej kolejności – położeniem Połocka pod okupacją moskiewską okupacją w 1563-1578 r. Zapewne przez pewien czas termin, który tracił już swe początkowe znaczenie („kraj Wisu" – „Albania" – Nowogród Wielki) i został jakby w stanie zawieszenia, używany jako ogólna nazwa ziem, powrotu których do Rzeczypospolitej potrzebowało społeczeństwo polsko-litewskie. Część z nich (quae Magno Ducatui Lituaniae adjecet subjacetque) była tylko krótko zajęta przez Państwo Moskiewskie, a inne stracone przez Wielkie Księstwo Litewskie w 1486-1537 r. Do tego autorzy różnych kompilacji historyczno-geo-

ciąg na s. 6

PRZYJECHAŁEM DO POLSKI...

У ЗМАГАНЬНІ ЧАС ВЯРТАНЬНЯ...

У змаганні шлях вяртаньня...

Хутчэй за ўсё гэтымі словомі кіруецца наш герой, з якім я вас пазнаёмлю расспачынаючы гэту рубрыку. Гэта Антон Л. Ён трапіў сюды „дзякуючы" павароту жыцця... але паслухайце лепш яго.

Як ты трапіў да Польшы?

Гісторыя пачынаецца з 17 кастрычніка 1999 года - ў Мінску адбыўся „Марш Свабоды-1" у якім я і мае сябры Герман, Глеб, Андрэй бралі непасрэдны ўдзел. Пасля нас арыштавалі і пасадзілі на „Валадарку" і ўзбудзілі крымінальную справу. Нас выпусцілі з вязь-ніцы на волю пад „падпіску аб нявыяздзе". Следства... 30 сакавіка суд.... які дагэтуль не абыўся!..



Прыехалі ...

Таму шта была прапанова зьехаць, якую мы і скарысталі. Хаця гэта і была гульня ў абяцанкі-цацанкі, ўжо, канешне, нам наабяцалі..., але мы падумалі і вырашылі паехаць. Чацьвёртага мы выехалі зь Менску і 20 сакавіка былі ў Варшаве.

А зараз як ты уладкаваўся ў жыцці?

Зараз я працую на так званым „Рускім стадыёне" - стадыён „дзесяцілецьця". Больш таго, у „Рускай бібліятэцы", дзе працу знайшоў сам!

А ўвогуле якія былі першыя ўражаньні аб Польшчы?

Адчуўся ўсёж-такі рэзкаваты пераход з нашага „саўка", ад сваіх праблем, ад свайго тэмпу жыцця. Усёж-такі тут чужы край, чужыя людзі, іншыя прынцыпы жыцьця.

Як моўны бар'ер? Пераскочаны?

На жаль, ён прынамсі не пераскочаны, таму што ў нас з Андрэем не было ніводных курсаў польскага, а самастойна атрымлівалася толькі з палякамі ў акадэміках.

А як ўвогуле - адчуваеш на сваім карку якія-небудзь праявы польскага шавінізму, калі ён ўвогуле існуе?

На жаль....але ведаеш, не ад усіх...а ўвогуле, істотная зьява ў гэтым грамадстве. Тут як бы рускіх ня любяць... ну ня тое што рускіх... хутчэй „людзей з ўсходу". Проста я так кажу, таму што, ужо звыкся з гэтым азначэннем - з Усходу - значыць, рускі, нягледзячы на то, што ты можаш быць роўна і украінцам і беларусам і малдаванам і кім заўгодна, але для паляка застаешся рускім, калі ты з усходу... на жаль гэта думка пануе сярод большасці гзта значыць сярод звычайных абыватэляў, а не інтэлектуалаў.

А наконт адносінаў, магу сказаць, ёсць і даволі добрыя палякі, шмат было і гаўнюшчых, у тых-жа акадэміках, у якіх я жыў, але яны розныя. Мне давялося ведаць такога украінца зь Львова, які лічыў за абразу, што ён жыве разам са мной, таму ўпарта не жадаў камунікаваць па-расійску і ўжываў толькі польскі. Хаця, канешне, ён ведаў і рускі, прынамсі, я-б яго разумеў і па-украінску, разумеў і па-польску, але было проста настолькі непрыемна, што прынцып узяў ўсёж-такі сваё. Ён да мяне па-польску, а я нахабна па-расійску, і выдатна разумелі адзін аднаго. А палякі таксама розныя сустракаліся, да аднаго ў пакой зайдзеш і пачуеш: "Гарбаты? Кавы?", тады чуюцца адносіны як да нармалёвага чалавека а не як да.... , а ў другога другія могуць быць адносіны.

Дык азначэнне добрага ці нядобрага паляка суадносяцца толькі дыскрымінацыяй мовы, ці талератнасцю і інтэлегентнасьцю?

У прынцыпе, можна сказаць і так, ня тое, што добры ці не... Залежыць зноў-такі ад чалавека, ад таго, што кіруе гэтым чалавекам у стасунке да беларусаў, рускіх, украінцаў, таму не магу я пра яго судзіць вельмі ўжо скрайне. Няхай ён мяне ня любіць, зрэшты, чаму ён павінен мяне любіць? Але элементарная гасьцёўнасць, адныя забываюць, у другіх яно адсутнічае, а у трэціх вельмі добра рэалізуе сябе! І паляк, які добра ведае сытуацыю на Беларусі, рады табе дапамагчы і дапамагаюць.

ciąg dalszy na s. 6

HISTORIA

ciąg ze s. 5

graficznych, które tworzono w Europie Zachodniej bez głębszego zbadania przedmiotu, mieszali wiadomości o zawojowaniu przez Iwana III Nowogrodu [...] i zajęciu Połocka przez Iwana IV w 1563 r.

Termin *Ruś Biała* w znaczeniu *Ruś Litewska* używali na początku albo cudzoziemcy [...], albo ludzie urodzeni w Wielkim Księstwie Litewskim – przedstawiciele edukowanych warstw społeczeństwa o prozachodniej orientacji [...]. Przyswojenie go przez „pospolitych" wschodnich Słowianami odbyło się w początku XVII w.

Dopiero od tego okresu *Ruś Biała* trafia z tworów polskich historyków i publicystów do miejscowych latopisów i kronik: „Kroniki Litewskiej i Żmudzkiej", „Hustyński letopis" i in. [...]

Podział na *Białą, Czarną i Czerwoną Ruś* w ogólnie przyjętej obecnie formie jest nie wcześniejszy od drugiej połowy XVII w. i w żadnym razie nie można uważać go za dziedzictwo właściwe słowiańskim wyobrażeniom o podziale Rusi [...]. Terminy *Czerwona* i *Czarna Ruś* powstały omal jednocześnie i przez długi czas konkurowały do prawa oznaczania tych samych terytoriów. Mianowicie *Czerwoną* nazywano w XV – XVI w. część Rusi, która wchodziła w skład Wielkiego Księstwa Litewskiego – na długo przed tym, gdy zaczęto nazywać je *Białą Rusią*.

W oficjalnych rosyjskich dokumentach z lat czterdziestych i pięćdziesiątych XVII w. w skład *Białej Rusi* włączano częściej ukraińskie niż białoruskie ziemie, a terminem „biełorusskoje piśmo" oznaczano całość graficznych i leksykalnych osobliwości, które odróżniały tzw. ,,zachodnioruski" język literacki od rosyjskiego. Rozszerzeniu areału choronimu *Biała Ruś*, w jego czasowym znaczeniu, na Ukrainę, sprzyjało wcześniejsze użycie tej nazwy dla terenów ukraińskich [w źródłach węgierskich z XIV i XV w. – przyp. tłum.]. Jednak nazwy *Ukraina* i *Mała Ruś* szybko wyparły *Białą Ruś* z użycia w tym samym znaczeniu. *Biała Ruś* w znaczeniu *Państwo Rosyjskie* spotyka się na niektórych europejskich mapach nawet w XVIII w., ale coraz rzadziej. Od końca XVII – początku XVIII w. można mówić o stabilizacji geograficznej denotacji omawianej nazwy; ostatecznie umocowała się na części ziem Wielkiego Księstwa Litewskiego, od dawna zwanych *Rusią* (w wąskim sensie) w odróżnieniu od właściwej *Litwy.* Taki stan rzeczy zachował się zasadniczo do końca XIX w., gdy na fali ruchu narodowego, lecz pod widocznym wpływem „zapadnorusizmu", *Biała Ruś* zaczęła być wykorzystywana jako określenie kraju, który z biegiem czasu stał się niezależną Republiką Białoruś.»

ZBYSZEK MISIUK

PRZYJECHAŁEM DO POLSKI...

Ты адчуваў інфармаванасць тваіх польскіх знаёмых аб нашай сытуацыі?

Так, але агульную інфармацыю, акрамя тых, што сапраўды гэтым цікавяцца. Хтосьці аб чымсці ведае, хтосці цікавіцца палітыкай увогуле і ведае якая яна ў нас, у Расеі, ува Ўкраіне і ў тых дзяржавах. Я ня вельмі люблю адказваць пры нашых дыскусіях, па якой прычыне я тут, нешматлікія палякі аб гэтым ведаюць, таму што я не жадаю, каб адносіны да мяне будаваліся як да ўцекача, што я бегаю і прашу пра дапамогу, а не пра якуюсьці міластыню.



Панэль Ведаў для "чаўнакоў"

Які-ж меў жыцьцярыс?

Я скончыў дзевяць клясаў - базавая адукацыя. У сярэднюю пасля перапынку жадаў пайсці ў гэтым годзе, але не атрымалася, трэба было ехаць, каб не атрымаць іншую „турэмную адукацыю".

Як я ведаю, прыехала чатыры асобы, і хтосьці з вас дакладна вучыцца, а ты не задумваўся аб навуцы?

Так, тут большасць навучаецца, але бач, я як прыехаў, то не быў ніякім студэнтам, якія навучаліся ўжо у Беларусі. Ім была хаця-б „гарантаваная" адукацыя, а мы - школьнікі - ехалі на поўную сваю рызыку. Мы пазнаёміліся з Ігарам Банцарам, які нам дапамог. Сустрэліся на пікеце каля амбасады РБ, дамовіліся, сустрэліся, пасля яшчэ. Ён пачаў нам дапамагаць і з дакументамі ў дэпартамент, і з навучаннем, бо ён ведаў дужа магчымасьцяў і таксама людзей. Таму так і атрымалася, што я жыву, і навокал усюды студэнты.



Варшава нечаканая мара.

А ў цябе прысутнічае прага да навукі, хаця-б польскай?

Я лічу, што можна было-б пайсці і закончыць ліцэй, але я маю надзею на зьмену стану ў нашай краіне, і ў дадатак мне тут настолькі абрыдла выжываць, што я-б з радасьцю паехаў па адукацыю дадому. А насамрэч ліцэй - гэта таксама не вельмі добры выхад. Напрыклад, у мяне была знаёмая, якая навучалася ў польскім ліцэе ў Варшаве, дзе былі адносіны не толькі вучняў, але і настаўнікаў даволі неталерантныя. Вельмі жорсткія адносіны былі паміж ёй і настаўнікамі. Таму, ведаючы гэтыя прыклады, ня вельмі-б жадаў прайці курс польскай навукі, хаця й не адмаўляюся. Найлепш было-б скончыць школу ў Менску, а пасьля ўжо пры магчымасці паступіць у польскі Унівэрсытэт.

Ці ты маеш жаданьне якойсьці інтэграцыі з польскім грамадствам, і ці было штосьці зроблена для гэтага?

Польскае грамадства - складанае для інтэграцыі ў яго, я ўжо прыводзіў у прыклад узаемаадносіны паміж рускімі і палякамі, палякамі і рускімі, але ў дачыненьні да Беларусі яны яшчэ горш. Я чуў нават думку, што ніколі не было Беларусі, была толькі Польшча і Расея. Але ўсё роўна мы мусім быць большымі дыпляматамі, чым яны, і захаваць прыяцельскія адносіны, яны-ж суседзі, ад чаго нам нікуды ня ўцякці.

Тут, у Польшчы ты сябе адчуваеш часткай Беларусі?

Так, ня ведаю, на колькі гэта адчуваньне павялічылася, але яно абвастранае зараз, адчуваецца патрэба ў людзях, якія цябе зразумеюць.

Як я разумею ты працуеш і сам сябе „акупаеш".

Мне нават прыемней, што я не мушу прасіць, хадзіць, клянчыць грошы. Ня-гледзячы на тое, што працую я ў даволі спэцыфічным месцы, у „Кіёску рускай кнігі".

Чаго ты чакаеш ад Польшы?

Я-б жадаў адчуць толькі звычайнае разуменьне, хацеў-бы мінімальнай якойнебудзь дапамогі, і гэта адзінае... Я тут часова. Я жадаю вярнуцца дамоў!

падрыхтаваў ПАВЕЛ РАХМАНАЎ.

GOŚĆ NUMERU / HOSĆ NUMARU

KRYVI (KRIWI)

спэцыяльна для INFARMATARA - Зьміцер Вайцюшкевіч

Informacja o zespole

KRYVI, czy krywiczy, tak zostało nazwane później starożytne plemię, które przyszło na Białoruś kilka tysięcy lat temu z Indii, jest nosicielem unikalnej kultury, zachowanej do dziś. W języku staroindyjskim 'krywi' - znaczy „krynica", "człowiek-chmura", "miech na wodę".

Zespół KRYVI powstał w roku 1993. Muzycy pracują w stylu tradycyjnego (obrzędowego) lićwińsko-białoruskiego folkloru, również we współczesnej aranżacji. Muzyka ta pochodzi z różnych regionów Białorusi. Piosenki łączą w sobie starożytne tradycje gardłowego śpiewania i współczesnego brzmienia z dodatkiem improwizacji i awangardy. Zespół gra na autentycznych instrumentach muzycznych (dudka, dudy, żalejka), wyprodukowanych według starodawnych technologii. Materiał muzyczny zbierany jest na wyprawach folklorystycznych po białoruskich wioskach.

Skład zespołu:

Vieranika Kruhłova – śpiew prowadzący;
Pit Pawław (Pit) – gitara;
Źmicier Vajciuškievič (Todar) – śpiew, multiinstrumentalista

Fonografia:
1) KRIWI „Hej lioli" 1997 r. – kaseta
2) KRIWI „Kriwi live in Berlin" 1997 r. – CD
3) KRIWI „Za tumanam" 1998 r. – kaseta
4) KRIWI „Za tumanam" 1999 r. – CD
5) KRIWI „Liudziam" 2000 r. – CD

Zespół uczestniczył we wspólnych muzycznych przedsięwzięciach: „Narodny albom" (1998)," Śviaty vieczar" (2000) i „Ja naradziusia tut"(2000), które zdobyły wielką popularność na Białorusi.

Muzycy KRYVI uczestniczyli w festiwalach i konkursach muzyki folkowej w różnych krajach świata, wielokrotnie zdobywając pierwsze nagrody. Wśród najbardziej prestiżowych – uczestnictwo w Pierwszym Interfolkowym Spotkaniu „Źródła Kultur" w Gdańsku, udział w 22 festiwalu Narodów Północy, koncerty w Berlinie (kluby: Junction Bar, Zosch, Advena, Kulturhausmitte, Checkpoint), udział w festiwalu „Głos Azji", Ałmaty, Kazachstan (specjalna nagroda od firmy „Roland"), występ na festiwalu „Maładaja Biełaruś", koncerty w Celtic Pub w Gdańsku, koncerty w Estonii. Na „Rok-Karanacyji", corocznej imprezie rokowej w Mińsku, na Białorusi, wokalistka Vieranika Kruhłova otrzymała tytuł „Rok Księżniczka", gitarzysta Pit Pawław - tytuł „Muzykant Roku".



Мэксыканскія капялюшы? Нашто? Нашыя лепшыя!

Што такое гурт "Крыві", як бы ты яго ахарактарызаваў для чалавека, які ніколі ня чуў вашай музыкі?

З.В.: У прынцыпе, гэта нейкая супольнасьць людзей, апантаных ідэяй выяўленьня саміх сябе. Мы ніколі не казалі ў інтэрв'ю, што займаемся фальклёрам прафэсыйна - мы паказваем, якія **мы** ёсьць, праз фальклёр. Мы ўвесь час езьдзілі ў экспэдыцыі, і ў часе гэтых экспэдыцыяў, у часе песьняў менавіта кантанкт зь людзьмі, якія жывуць на вёсках, даў нам зразумець, дазволіў глыбей пагледзець на ўсё тое, што тычыцца Беларусі, беларускага фальклёру. Тэма фальклёру ўвогуле вельмі глыбокая, і немагчыма ўспрымаць яе толькі празь песенны матэрыял. Гэта спосаб жыцьця, спосаб нашай уласнай унутранай незалежнасьці, таму што творца ў нейкім сэньсе вагаецца: з кім ісьці, куды ісьці. Гэта вельмі важна, таму што менавіта праз гэты незалежны шлях у творчасьці мы ўзбагачаемся й разьвіваемся.

І яшчэ адна важная рэч – мы ўвесь час езьдзім па розных краінах, і для нас вельмі істотна мець Сваё, паказваць Сваё, і пры гэтым зьбіраць розныя эмоцыі, новыя пэрсанажы... У двух словах можна сказаць так: "Крыві" – гэта шлях да сябе, шлях да Вольнасьці Чалавечай у сярэдзіне сябе, да раскамплексаванасьці і хрысьціянскай Вольнасьці, калі можна так сказаць.

А чаму вы абралі менавіта фальклёр? Вядома, што творца выражаецца ў розных галінах – гэта мог-бы быць рок, сюррэалізм альбо што заўгодна іншае... Як і калі гэта атрымалася?

Калі прыгледзецца, то большая частка гурту "Крыві" – гэта "Палац", прычым тая ягоная частка, што езьдзіла ў экспэдыцыі (за выняткам Алега Хаменкі). Мы амаль выпадкова паехалі ў экспэдыцыю, і можа, праз гэта, празь нейкую Боскую ласку атрымалі нейкую асалоду, нейкі штуршок для разуменьня, для пачынаньня працы над гэтам матэрыялам. Не заўсёды бывае так, што ты можаш даведацца пра нешта ад сяброў ці праз тэлевізію, часам трэба самому паехаць, зьесьці шмат пылу й выпіць трохі гарэлкі, паразмаўляць зь людзьмі, паглядзець на іх. Мы робім гэта зь 1993 года, столькі ж існуе наш гурт, 8 сакавіка 2001 года мы сьвяткуем 4-х гадовы юбілей. Я лічу, што за чатыры гады мы зрабілі вельмі шмат.

А чым ты тлумачыш, сапраўды, такую вялікую папулярнасьць вашага гурта? Беларуская моладзь неахвотна схіляецца да фольку.

Справа ў тым, што я не лічу нас надзвычай папулярнымі, хаця можна прыгадаць, што мы - рок-каралі, і шмат дзе былі, і ў Польшчы нас дастаткова добра ведаюць людзі, што цікавяцца фальклёрам, і "новым" фальклёрам, але я лічу, што перадусім мы

цяг на с. 8

GOŚĆ NUMERU

цяг са с. 7

працуем. Гэта нармалёвы шлях для кожнага чалавека: ня можна сядзець дома і чакаць, што вось, будуць канцэрты, будуць гастролі, будуць інтэрв'ю, зьявяцца нейкія спонсары, і ўвогуле, што мы - геніі, толькі пішам "у шуфляду". Я лічу, што наш штодзённы шлях - гэта штодзённая праца над сабой, нават калі няма канцэртаў – гэта праца з музыкай, праца зь людзьмі... Мы з табой размаўляем – я таксама нешта для сябе бяру, і гэта ёсьць унутраная чалавечая праца. І – ня ведаю, нясьціпла гэта будзе ці сьціпла - але мы, як нармалёвыя бізнэсоўцы, плянуем сабе: што мы мусім зрабіць сёньня. Мы стараемся ўсьвядоміць сабе й зразумець, што мы будзем рабіць праз некалькі гадоў. Шмат для каго ў Беларусі такія паняткі не існуюць, як ў "Нашай Ніве" пісалі: адзімавалі, а заўтра – вясна, пасяўная... У нас, дзякуй Богу, няма такой праблемы, мы стараемся дакладна ведаць і разумець – што мы будзем рабіць далей, заўтра.

Якую праграму вы мяркуеце прадставіць у Варшаве, чым зьбіраецеся зацікаваць польскага слухача? Чаму варта прыйсьці на ваш канцэрт?

Увесь час, калі мы выступаем у іншых краінах, я зьдзіўляюся, чаму нас слухаюць, і слухаюць вельмі ўважліва. Думаю, што перадусім – гэта чалавечыя эмоцыі, рэчы, зразумелыя ўсім, незалежна ад моўнага бар'еру. Ёсьць прынцыпы чалавечых стасункаў, аднолькавы для розных краінкў: гэта каханьне, стаўленьне чалавека да чалавека, сяброўства, нейкая варожасьць, нейкі сьмех, нейкая іронія...У прынцыпе, праз фальклёр, праз тое, што мы робім, мы паказваем гэтыя эмоцыі.

А што будзе на канцэрце? Гэта будуць новыя творы, таму што напрыканцы студзеня мы запісалі альбом у Бэрліне, гэта будуць і новыя інтэрпрэтацыі старых рэчаў, якія проста пачалі гучаць па-новаму, бо мы ўвесь час дзякуючы гэтым паездкам разумеем, што трэба працаваць над старымі рэчамі, зьмяняць іх згодна з жыцьцём і часам.

Вы шмат езьдзіце па Эўропе. Для вас словаспалучэньне "Беларусь" і "Эўропа" - гэта фантастыка ці рэальнасьць?

Безумоўна, Беларусь – гэта частка Эўропы. Мы не чакаем, што заўтра зьявяцца, да прыкладу, вялікія інвэстыцыі ў беларускую культуру з боку беларускай дзяржавы альбо з захаду, мы проста самі, як шмат людзей у розных іншых сфэрах, можа, павольна, але плённа працуем і ведаем, чаго мы хочам. І я ня бачу іншага кірунку разьвіцьця для Беларусі.

Размаўляла ВОЛЬГА ГАРДЗЕЙЧЫК-МАЗЯРСКА

KLUBY, IMPREZY, INFORMACJA ...

BIEŁARUSKIJA STARONKI W SIECIVIE

http://www.belarusguide.com/main/index.html віртуальны гід па Беларусі
http://admi.net/world/by/index_by.html старонка інфармацыяў пра Беларусь

Грамадзтва, палітыка:
http://members.xoom.com/litvania
http://members.nbci.com/BelarusNews/ беларускія навіны
http://www.kraj.org/ віртуальная кнігарня
http://www.belarus.ourfamily.com/ агульныя інфармацыі пра Беларусь (у тым - па-ангельску)
http://www.charter97.org/ Хартыя-97
http://ngo.unibel.by/ Асамблея Дэмакратычных Няўрадавых арганізацыяў Беларусі
http://bnf.virtualave.net/ старонка Беларускага Народнага Фронту "Адраджэньне"
http://www.belcentrum.org/ Беларускі Цэнтар у Празе
http://bsa.org.by/ Задзіночаньне Беларускіх студэнтаў (і па-ангельску)

Дыяспара:
http://zbsb.virtualave.net/ Згуртаваньне беларусаў сьвету "Бацькаўшчына"
http://belam.cjb.net/ Беларуска-Амэрыканскае Задзіночаньне
http://www.skaryna.clara.net/skaryna/ Беларуская бібліятэка й музэй у Лёндане
http://www.ngonet.ee/eva/ Грюнвальд - Асацыяцыя Беларусаў Эстоніі
http://www.cyberus.ca/~belarus/ згуртаваньне Беларусаў Канады – Атаўскі аддзел
http://www.geocities.com/Athens/Atlantis/8005/ старонка Беларусаў Санкт-Пецярбурга

Мова:
http://tbm.org.by/ старонка Таварыства Беларускай мовы
http://www.ceti.com.pl/~hajduk/ беларуска-ангельскі слоўнік
http://www.geocities.com/dipela/ штучныя мовы (эспэранта і інш)

Музыка:
http://na.home.by/ Народны Альбом
http://nrm.home.by/ НРМ
http://ulis.home.by/ Уліс
http://www.znich.com/ Зьніч
http://deviationband.cjb.net/ Devition
http://bas2000.prv.pl/ Басовішча
http://www.twoserge.kryvia.net/rk/ Радыёкропка – беларуская музыка ў mp 3
http://www.rokhitparad.republika.pl/ rok-hit-parad bieiaruskamounaje muzyki
http://belmusic.hypermart.net/ Беларуская Музычная крыніца
http://bma.home.by/ BMA Group. Беларуская Музычная Альтэрнатыва

Радыё:
http://www.svaboda.org/ Радыё Свабода
http://www.racyja.pl/2000/March/index_b.htm Радыё Рацыя
http://radyjo.8m.com/ Беларуская рэдакцыя Польскага Радыё
http://www.sbs.com.au/radio/belarusian/belarusian2.html Беларуская старонка Радыё SBS

Газэты, часопісы:
http://niva.cjb.net/ Наша Ніва
http://www.svaboa.com/ Наша Свабода
http://tbm.org.by/ns/ Наша Слова
http://www.kurier-poranny.com/niwa/ Ніва (беластоцкая)
http://www.baj.unibel.by/ Навіны беларускай асацыяцыі журналістаў
http://www.pahonia.promedia.minsk.by/ Пагоня
http://www.runbel.lt/ Рунь
http://sana.org.by/ SANA – Свойскае Агенства Навінаў і Аргумэнтаў
http://kapp.nsys.by:8101/ Рабочы
http://www.belapan.com/stat.html БелаПАН (інфармацыйнае агенства)
http://zolak.freeservers.com/ Kraina – dyskusijnyja forumy
http://arche.itgo.com/ ARCHE

Informacja od Liceum Społecznego Ogólnokształcącego 25 w Warszawie

1. czerwiec 2001 — cykl wykładów z historii sztuki Rosji i Białorusi, prowadzonych przez wykładowcę ASP w Mińsku, rzeźbiarza Pawła Wojnickiego i pracownika naukowego Muzeum Narodowego w Mińsku Nadzieję Usową. Wstęp bezpłatny. Zapraszamy!

2. czerwiec 2001 – spotkanie z tłumaczem „Dziadów", białoruskim bardem Sierżam Minskiemičam. Występ zespołu rokowego „Žach" z Mińska. Wstęp płatny – 10 zł. Zapraszamy!

Zasnavalnik:
Instytut Biełaruskaj Kultury
Redakcyja:
Volha Hardziejčyk-Maziarska
Ludmiła Huliakievič
Władzimier Michnievič
Tel: 863-67-79, 0501-032-540
E-pošta: ludazach@it.com.pl
Adras: 00-031, Warszawa,
ul. Szpitalna 5/5, II piętro